| 144. | Ул. Я. Лучины, 64, помещения в КБО: №№ 39, 49, 50 – с естественным освещением, № 51 – без естественного освещения (под пошив и ремонт одежды) | 58,4 | 1100 |
| 145. | Ул. Я. Лучины, 64, помещения в КБО: № 46 – с естественным освещением, три смежных помещения: №№ 30, 32 – с естественным освещением, № 31 – без естественного освещения (под швейное производство) | 246,0 | 4610 |
| 146. | Ул. Я. Лучины, 64, помещения в КБО: № 48 – с естественным освещением (под изготовление и ремонт ювелирных изделий) | 44,0 | 830 |
| 147. | Ул. Герасименко, 28, помещение № 44 на первом этаже, без естественного освещения, имеется отопление, санузел совместного пользования (под производственные цели) | 3,2 | 60 |
| 148. | Ул. Герасименко, 28, помещение № 49 на первом этаже, без естественного освещения, имеется отопление, санузел совместного пользования (под непроизводственные — офис, производственные цели) | 18,2 | 350 |
| | **УП «Минутка» тел. 200-99-90** | | |
| 149. | Ул. Тухачевского, 9, помещение на втором этаже в здании химчистки (под непроизводственное – офис) | 18,3 | 350 |
| | **ГСКУП «Бизнес–центр «Столица» тел. 239-76-24** | | |
| 150. | Пр. Победителей, 59, помещение № 203 на втором этаже – одна комната в двухкомнатном блоке, санузел совместного пользования (под непроизводственное — офис) | 57,0 | 1100 |
| 151. | Пр. Победителей, 59, помещение № 205 на втором этаже (под непроизводственное — офис) | 75,15 | 1410 |
| 152. | Пр. Победителей, 59, помещение № 211 на втором этаже (под непроизводственное — офис) | 32,85 | 620 |
| 153. | Пр. Победителей, 59, помещение № 212 на втором этаже (под непроизводственное — офис) | 68,4 | 1300 |
| 154. | Пр. Победителей, 59, помещение № 216 на втором этаже (под непроизводственное — офис) | 12,6 | 240 |
| 155. | Пр. Победителей, 59, помещение № 305 на третьем этаже (под непроизводственное — офис) | 75,6 | 1420 |
| 156. | Пр. Победителей, 59, помещение № 401 на четвертом этаже (под непроизводственное — офис) | 148,2 | 2800 |
| 157. | Пр. Победителей, 59, помещение № 402 на четвертом этаже (под непроизводственное — офис) | 129,3 | 2500 |
| 158. | Пр. Победителей, 59, помещение № 403 на четвертом этаже (под непроизводственное — офис) | 147,45 | 2800 |
| 159. | Пр. Победителей, 59, помещение № 404 на четвертом этаже (под непроизводственное — офис) | 128,1 | 2400 |
| | **УП «УДМС и Б Мингорисполкома» тел. 203-13-73** | | |
| 160. | Ул. Радиальная, 17, помещение в административном корпусе, требуется ремонт (под производственные цели) | 33,7 | 640 |
| | **ГПО «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома» тел. 233-26-64** | | |
| 161. | Ул. Кижеватова, 62а, помещение в одноэтажном кирпичном здании, без естественного освещения, отопления и коммуникаций (под склад) | 19,4 | 370 |
| 162. | Ул. Д.Сердича, 88а, помещение в одноэтажном кирпичном здании, без естественного освещения, отопления и коммуникаций (под склад) | 16,5 | 310 |
| | **УП «Минские вторичные ресурсы» тел. 242-73-85** | | |
| 163. | Ул. Летняя, 38 а, помещение в одноэтажном здании, имеется естественное освещение, энергоснабжение, санузел совместного пользования (под непроизводственное – офис) | 31,6 | 600 |
| | **КУП «Минская овощная фабрика» тел. 344-36-82, 344-29-02** | | |
| 164. | Минский р-он, п/о Тростенец, ангар, без воды, телефона, электроэнергии, требуется ремонт (для производственного использования) | 400 | 7500 |
| 165. | Минский р-он, п/о Тростенец, комната в здании ФОКа, без телефона и отопления (под непроизводственное — офис) | 27,93 | 530 |
| | **ЭКУО «СоколКоммунСервис» тел. 279-61-27** | | |
| 166. | Ул. Барамзиной, 12 а, помещение на втором этаже административного здания (под непроизводственное – офис) | 24,2 | 460 |
| | **КДУП «Городские парки Минскзеленстроя» тел. 280-04-49** | | |
| 167. | Ул. Фрунзе, 2, специфическое сооружение на территории центрального детского парка им. М. Горького (под площадку для установки сезонного нестационарного объекта мелкорозничной торговли под реализацию сладкой кукурузы с 15.04.09 по 31.10.09) | 6,0 | 1000 |

**Организатор аукциона (продавец) – КУП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.**

Участник аукциона до начала его проведения должен выяснить у балансодержателя возможность использования помещения под планируемые виды деятельности, в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам, указанным в его заявлении) и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на расчетный счет 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень и порядок подачи документов определены условиями проведения аукциона, которые **предоставляет участникам торгов организатор аукциона** после публикации извещения в газете «Звязда».

Условия и сроки оплаты: разовый платеж в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке в 30-дневный срок с даты принятия решения Мингорисполкома.

**Аукцион состоится 29 апреля 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие принимаются по 25 апреля 2009 года до 13.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок (017) 227-40-22, 227-48-36. Интернет: www.mgcn.by.**

Целевое назначение помещений определяется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и предусматривает:

- ***«непроизводственное целевое использование»*** — использование помещений для размещения руководителей, специалистов высшего уровня квалификации по предпринимательской деятельности и кадрам, в области права, в области общественных и родственных наук (в соответствии с общегосударственным классификатором «Профессии рабочих и должности служащих»), а также индивидуальных предпринимателей, осуществляющих в установленном порядке деятельность с привлечением физических лиц по трудовым и (или) гражданско-правовым договорам;
- ***«смешанное целевое использование»*** — использование помещения одновременно в производственных и непроизводственных целях;
- ***«производственное целевое использование»*** — использование помещения непосредственно для выпуска продукции, выполнения работ и оказания услуг с размещением на арендуемых площадях рабочих и специалистов, а также для складирования продукции, товаров. К помещениям производственного целевого использования относятся также помещения актовых, спортивных, выставочных залов, подсобные помещения, предназначенные для обслуживания деятельности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (кладовые, раздевалки, умывальники, комнаты для приема пищи), др.

***Порядок определения размеров арендной платы*** при сдаче в аренду зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, установлен Указами Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и от 4 августа 2006 г. № 498 «О некоторых вопросах аренды государственного имущества».

***Арендуемая площадь*** – площадь, сдаваемая в аренду, размер которой определяется умножением нормируемой площади на коэффициент перевода.

УНП 190398583



Прамая лінія

# САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА: КАМУ І НА ЯКІХ УМОВАХ?

**Інваліды, ветэраны, шматдзетныя сем'і — не сакрэт, што іх значная частка мае патрэбу ў дапамозе. А адсюль і па-сапраўднаму няпростыя пытанні. Паслугі дома і льготы, догляд і кватэрныя праблемы — усё гэта стала тэмамі нашай «прамой лініі» з удзелам спецыялістаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Такім чынам, на званкі чытачоў «Звязды» адказвалі начальнік аддзела па справах інвалідаў Рыта Валянцінаўна СУШКО, начальнік аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання Таццяна Іванаўна КАСЦЮКОВІЧ і начальнік аддзела па справах ветэранаў і пажылых людзей Іван Пятровіч НАГІБІН.**





***☎ — Мая поўнагадовая пляменніца, якая з'яўляецца круглай сіратой, цяпер працуе па размеркаванні ў Мінску і там жа стаіць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў як малады спецыяліст. Ці мае яна ў гэтай чарзе якія-небудзь перавагі?***

**Соф'я Фёдараўна Сізова,** *Івацэвіцкі раён*

— Усе пытанні, якія датычацца выдзялення жылля, пастаноўкі ў чаргу і пераваг у гэтай чарзе, адносяцца да кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў — райвыканкамаў або адміністрацый раёна. Таму для атрымання падрабязнай кансультацыі вашай пляменніцы неабходна звярнуцца менавіта туды — зразумела, з дакументамі, якія пацвярджаюць яе статус асобы з ліку дзяцей-сірот.

***☎ — Пасля інсульту мой сын часткова страціў магчымасць рухацца, яму цяжка размаўляць. Аднак пры гэтым яму прызначылі не І, а толькі ІІ групу інваліднасці. Чаму? І другое пытанне: якую дапамогу могуць аказваць сыну?***

**Ніна Пятроўна Мачко,** *Валожынскі раён*

— Адразу варта заўважыць: пасля абследавання канкрэтнага чалавека групу вызначаюць медыка-рэабілітацыйныя экспертныя камісіі, якія адносяцца да органаў аховы здароўя. Таму з пытаннем змянення групы інваліднасці неабходна звяртацца менавіта да медыкаў, а пачынаць тут трэба са сваёй паліклінікі ці райбальніцы, дзе запоўняць адпаведны пасыльны ліст і накіруюць яго ў МРЭК.

Наконт жа другога пытання можна сказаць наступнае. Непрацуючым пенсіянерам і інвалідам магчыма аказанне дапамогі з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва — для гэтага трэба напісаць заяву ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама. Апроч таго, сёння ў кожным раёне дзейнічаюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. І ў тым ліку гэтыя цэнтры аказваюць пенсіянерам і інвалідам самыя розныя паслугі. Скажам, гаворка можа ісці аб куплі прадуктаў харчавання і лекаў, прыбіранні памяшканняў, аплаце жыллёва-камунальных паслуг і г.д.

***☎ — У 1972 годзе мне прызначылі інваліднасць ІІІ групы па працоўнай траўме, прычым у 1977 годзе групу вызначылі пажыццёва. Аднак нядаўна, з-за адсутнасці даведкі аб страце працаздольнасці, мне прапанавалі прайсці паўторны агляд УКК. А пасля агляду высветлілася: ступень працаздольнасці зменшылася з 50 да 25 %. Як вынік, зменшыліся выплаты. Ці павінен я быў праходзіць камісію, калі група была вызначана пажыццёва?***

**Анатоль Міхайлавіч Ігнатовіч,** *г. Стоўбцы*

— На жаль, Анатоль Ігнатавіч, пытанне крыху не па адрасе — адказваць на яго павінны прадстаўнікі медыцыны.

***☎ — Мне 70 гадоў, жыву адзін, з'яўляюся інвалідам ІІ групы. На якую дапамогу я магу разлічваць? І, да прыкладу, ці магу я разлічваць на дапамогу ў рамонце дома?***

**Уладзімір Яфрэмавіч Скалубовіч,** *Крупскі раён*

— Калі вы маеце патрэбу ў дапамозе ў хатніх справах, можна зноў-такі звярнуцца ў раённы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. У цэнтры падрабязна раскажуць пра ўсе віды паслуг і, пры неабходнасці, заключаць дагавор на іх аказанне.

Што да рамонту дома, то нялішне заўважыць: дом з'яўляецца прыватнай уласнасцю, гэта значыць, што перш-наперш усе работы па яго ўтрыманні павінен рабіць уласнік. Разам з тым, паколькі вы жывяце адзін і маеце групу інваліднасці, тут можна паспрабаваць звярнуцца па дапамогу — у райвыканкам, сельскі або пасялковы Савет.

***☎ — Я адзінокая, жыву з братам-пенсіянерам, інвалід І групы ад агульнага захворвання, маю 75 гадоў. Якімі льготамі я магу карыстацца?***

**Тэрэза Станіславаўна Кісялеўская,** *Гродзенскі раён*

— Паводле Закона «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян», для інвалідаў І групы (за выключэннем асобаў, прычынай інваліднасці якіх сталі супрацьпраўныя дзеянні, алкагольнае, наркатычнае, таксічнае ап'яненне ці наўмыснае пашкоджанне свайго арганізма), вызначаны наступныя льготы.

Першае. 90-працэнтная зніжка з кошту лекаў, што выдаюцца па рэцэптах медыкаў у межах пераліку асноўных лекавых сродкаў, а інвалідам І групы з хірургічнымі захворваннямі пры наяўнасці адпаведнага медыцынскага заключэння — і з кошту перавязачных матэрыялаў у парадку, які вызначае Савет Міністраў.

Другое. Права на бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў (за выключэннем пратэзаў з каштоўных металаў, металаакрылатаў, металакампазітаў, металакерамікі і фарфору, а таксама нанясення абаронча-дэкаратыўнага пакрыцця з нітрыд-тытану) у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя па месцы жыхарства.

Трэцяе. Забеспячэнне іншымі тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі паводле Дзяржаўнага рэестра ў парадку і на ўмовах, вызначаных Саветам Міністраў.

Чацвёртае. Для непрацуючых інвалідаў І групы вызначана права на першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці проціпаказанняў або аздараўленне пры адсутнасці проціпаказанняў — не больш за адзін раз у два гады. Пры гэтым асоба, якая суправаджае інваліда І групы ў санаторна-курортныя або аздараўленчыя арганізацыі, таксама забяспечваецца бясплатнай пуцёўкай без лячэння — пры ўмове, што неабходнасць у падобным суправаджэнні пацвярджаецца заключэннем урачэбна-кансультацыйнай камісіі.

Пятае. Інваліды І групы могуць карыстацца бясплатным праездам на ўсіх відах гарадскога пасажырскага транспарту, апроч таксі, незалежна ад месца жыхарства, а інваліды І групы, якія жывуць у сельскай мясцовасці, — таксама на аўтамабільным транспарце агульнага карыстання рэгулярных міжгародніх зносінаў у межах адміністрацыйнага раёна па месцы жыхарства. Зноў-такі апошняе датычыцца і асобаў, якія суправаджаюць інваліда І групы.

Шостае. У інвалідаў гэтай групы застаецца права на бясплатны праезд на чыгуначным, водным і аўтамабільным транспарце агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносінаў — за выключэннем таксі. Прычым асоба, якая суправаджае інваліда І групы па накіраванні дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя да месца аказання медыцынскай дапамогі і назад, тут таксама карыстаецца бясплатным праездам.

Апроч таго, інваліды І групы, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, што абавязаны ўтрымліваць іх у адпаведнасці з законам, жывуць адны або толькі з інвалідамі І і ІІ груп, непрацуючымі пенсіянерамі на агульнай падставе, маюць права на 50-працэнтную зніжку з аплаты за тэхнічнае абслугоўванне і карыстанне жылым памяшканнем (з разліку на 20 квадратных метраў агульнай плошчы), права на 50-працэнтную зніжку з аплаты камунальных паслуг (гарачае і халоднае водазабеспячэнне, каналізацыя, газ, электра- і цеплаэнергія, вываз смецця, карыстанне ліфтамі) паводле вызначаных тарыфаў і ў межах нормаў спажывання, а інваліды І групы, якія жывуць у дамах без цэнтральнага ацяплення, — зніжку на паліва, якое набываецца зноў-такі ў межах вызначаных нормаў.

***☎ — У праекце закона аб сацыяльных ільготах ветэранам вайны была вызначана 50-працэнтная зніжка з кошту тэхабслугоўвання і камунальных паслуг. Аднак у самім законе з'явіўся ўжо іншы запіс: 50-працэнтная зніжка з кошту тэхабслугоўвання і камунальных паслуг зыходзячы з 20 квадратных метраў памяшкання. Чаму зніжка прадастаўляецца зыходзячы з агульнай, а не жылой плошчы? І чаму гэта льгота не датычыцца жонак ветэранаў вайны ў сем'ях без працаздольных асобаў? Бо жонкі даглядаюць ветэранаў. Тым часам як утрыманне ветэрана ў доме-інтэрнаце абыдзецца дзяржаве больш за мільён рублёў у месяц.***

***І яшчэ. За ветэранамі вайны пакінулі льготы на праезд. Аднак фактычна 70 % ветэранаў сядзяць дома і не карыстаюцца гэтай льготай. Ці не было б больш правільна аказваць гэтым людзям іншую падтрымку — скажам, крыху павялічыць пенсію?***

**Анатоль Ігнатавіч Мачульскі,** *старшыня Савета ветэранаў Фрунзенскага раёна г. Мінска*

— Нармаванне сацыяльных ільгот — з'ява натуральная. Прынамсі, ва ўсім свеце існуе падыход: ільготамі павінен карыстацца непасрэдна чалавек, які іх заслужыў, а не члены яго сям'і. Што ж да самога нарматыву ў 20 квадратных метраў, то, трэба меркаваць, у гэтым выпадку камунальнікі зыходзілі з агульнага спажывецкага стандарту.

І наконт праезду. Манетызацыі гэтай льготы ў нас не плануецца, а што да пенсіі, то можна нагадаць: для ўдзельнікаў вайны ў нас вызначана яе павышэнне на 250 % ад мінімальнай пенсіі па ўзросце. Прычым гэта норма дзейнічае даўно.

**Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**
***(Працяг будзе.)***

Ёсць праблема!

# СЕТКА СУМНЕННЯЎ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Як мы ўжо паведамлялі раней, у рыбгасах сістэмы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання з пачатку красавіка распачаўся сезон платнай рыбалкі на закрытых сажалкавых вадаёмах. Нагадаем, што ўсяго такую паслугу прапануюць ахвотным 17 гаспадарак прыкладна на паўсотні сажалак. Для платнай лоўлі дазволены карп, карась, таўсталобік, белы амур, шчупак. Сярэдні кошт пуцёўкі на адзін дзень складае ад 20 да 30 тысяч рублёў. Норма вылаву ў большасці выпадкаў складае 5 кілаграмаў, здабываць рыбу можна ў светлы час сутак. І вось менавіта наконт прыладаў лоўлі ўзнікла адно пытанне.**

Раней лавіць рыбу на закрытых сажалкавых вадаёмах дазвалялася на вуду. Сёлета ж, каб прыцягнуць рыбаловаў, было вырашана дазволіць выкарыстанне перамётаў, а таксама лодак. Больш за тое, паводле інфармацыі дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадарцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, у асобных рыбгасах у якасці эксперыменту дазваляецца лоўля рыбы з дапамогай сетак, выкарыстанне якіх у натуральных рыбалоўных угоддзях, нагадаем чытачам, забаронена. Ну ды тут парушэння ніякага няма, бо сажалкі рыбгасаў не адносяцца да рыбалоўных угоддзяў і Правілы вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства на іх не распаўсюджваюцца. Праблема бачыцца ў іншым.

Яшчэ 1 жніўня 2002 года ўступіла ў сілу пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусі, згодна з якой у краіне забаронены свабодны продаж рыбалоўных сетак і сеткаматэрыялаў. З пазначанай даты на законных падставах, прычым толькі ў спецыялізаваных крамах, рыбалоўныя сеткі і сеткаматэрыялы могуць набываць толькі для прамысловай лоўлі рыбы арандатары рыбалоўных угоддзяў. Прычым яны павінны мець адпаведную ліцэнзію, пасля набыцця на сетках у вызначаным парадку ў рыбаахоўных інспекцыях ставяцца біркі. У пералік сеткаматэрыялаў, на якія распаўсюджваецца забарона, трапілі таксама так званыя «тэлевізары», «павукі», «пад'ёмнікі». Забарона на свабодны продаж сетак і сеткаматэрыялаў была прынята ў мэтах узмацнення дзяржаўнага кантролю ў галіне аховы і выкарыстання жывёльнага свету і папярэджання незаконнай здабычы рыбы і іншых відаў водных жывёл. Мера цалкам правільная і патрэбная. Нават цяпер, пасля амаль шасці гадоў дзеяння названай пастановы, кожны тыдзень рэгіструюцца шматлікія выпадкі браканьерства з дапамогай сетак, хоць за такія дзеянні прадугледжаны даволі суровыя меры пакарання. Дык вось, сёння фізічная асоба не мае законнага права на набыццё сетак. А чым тады такі рыбак будзе лавіць рыбу на закрытых сажалкавых вадаёмах рыбгасаў, калі вырашыць скарыстацца выпаўшым дазволам?.. Перш чым даваць нейкі канкрэтны адказ на гэтае пытанне, мы вырашылі пацікавіцца ім у дырэктараў асобных рыбгасаў, дзе, паводле атрыманай намі ў дэпартаменце меліярацыі і воднай гаспадаркі Мінсельгасхарча інфармацыі, збіраюцца ўкараняць такую паслугу. Што па гэтым пытанні думаюць самі кіраўнікі?

**Іван ЦЫГАН, дырэктар рыбгаса «Лактышы»:**

— Сезон платнай рыбалкі на закрытых сажалкавых вадаёмах мы распачалі літаральна сёння. Білет каштуе 20 тысяч, лавіць рыбу можна з 5 гадзін раніцы да 20 гадзін вечара. Норма вылаву складае 5 кілаграмаў, кошт гэтай рыбы ўваходзіць у цану білета. Калі чалавек за дзень так нічога і не злавіў, дык па прад'яўленні талона мы даём яму 2 кілаграмы рыбы — у якасці суцяшальнага бонуса. Але лоўля ў нас пакуль вядзецца толькі на вуды. Наконт выкарыстання сетак яшчэ канчаткова нічога не вырашана. Шчыра кажучы, ёсць некаторыя пытанні: можна ці не дазволіць лоўлю з дапамогай сетак. Іх трэба абмеркаваць і з уласнай рыбааховай, і, магчыма, зрабіць запыт на адрас Дзяржінспекцыі.

**Мікалай ЯРАХОВІЧ, дырэктар рыбгаса «Белае»:**

— Я дазволіў бы платную лоўлю толькі на зімавальных сажалках: 10 хвілін такой «рыбалкі» — і сетка поўная. Безумоўна, далёка не ўсім рыбаловам падабаецца такі спосаб лоўлі, я і сам выступаю за вуду. Пуцёўка ў нас каштуе 30 тысяч за дзень, норма вылаву складае 4 кілаграмы, кошт якіх уваходзіць у цану білета. За кожны кілаграм звыш нормы — даплата з разліку 7,5 тысячы рублёў. Але ёсць яшчэ адна праблема. Рыбаловы, якія хацелі б скарыстацца сеткамі, забяруць з улову толькі буйную рыбу, а дробную — адпусцяць назад. Але аб'ячэеная рыба жыць ужо не будзе, навошта мне такія страты? Я за тое, каб пры лоўлі сеткай чалавек забіраў цалкам увесь улоў. Колькі можна дазволіць здабываць такім спосабам? Ды хоць 200 кілаграмаў, хоць тону. Толькі, як ужо сказаў, забірай усё і плаці за рыбу. Так, тэлефонныя званкі наконт лоўлі сеткай былі, аднак ніхто яшчэ на практыцы не скарыстаўся такой магчымасцю.

Меркаванні кіраўнікоў рыбгасаў — даволі пакуль насцярожаныя — мы пачулі. Хоць, паўторымся, арганізоўваць платную рыбную лоўлю з дапамогай сетак яны маюць права. Цяпер вернемся да галоўнай тэмы: а дзе ахвотнаму браць тыя прылады рыбалоўства, калі сам іх факт куплі для фізічнай асобы з'яўляецца парушэннем заканадаўства? Выйсце бачыцца толькі адно: выдача сетак у арэнду рыбаловам самімі рыбгасамі. Праўда, дырэктар рыбгаса «Белае» Мікалай Яраховіч да такой прапановы паставіўся зноў жа насцярожана, маўляў, няма ў нас для гэтага сетак, пакуль не ведаем, як вырашыць такое пытанне.

**Начальнік аддзела аховы жывёльнага свету ўпраўлення аналізу і кантролю за аховай і выкарыстаннем аб'ектаў жывёльнага і расліннага свету Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Таццяна ЦІТОВА**, да якой мы звярнуліся па каментарыі, прызнала справядлівасць узнятай праблемы.

— Рыбгасы, якія як юрыдычныя асобы маюць набытыя ў законным парадку для прамысловай лоўлі сеткі, калі апошнія выкарыстоўваюцца не ў поўнай меры, сапраўды могуць даваць іх у арэнду рыбаловам пры арганізацыі платнай рыбнай лоўлі на закрытых сажалкавых вадаёмах. А ўвогуле наконт фізічных асобаў вы маеце рацыю — пытанне патрабуе больш дэталёвага вывучэння з удзелам усіх зацікаўленых бакоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Крупнейшее предприятие «Белрыба»**
в связи с расширением производства в г. Браславе
**ПРИГЛАШАЕТ НА РАБОТУ:**
- СМЕННОГО МАСТЕРА ЦЕХА;
- ИНЖЕНЕРА ПО ОБОРУДОВАНИЮ С В/О;
- ОБРАБОТЧИКОВ МОРЕПРОДУКТОВ.

Достойная заработная плата; система премий и поощрений; доброжелательный коллектив; лояльный руководитель; хорошие условия труда.
УНП 190000166
Тел.: (8 02153) 31 5 16, 31 2 70

# КУП «МІНСКХЛЕБПРАМ»: ДА СПАЖЫЎЦА З ЛЮБОЎЮ




**Які Вялікдзень без святочнага куліча? Некаторыя гаспадыні яшчэ і сёння выпякаюць кулічы самі, аднак большасць аддае перавагу пакупным святочным вырабам (тым больш, што выбраць зараз ёсць з чаго).**



Сталічныя спажыўцы даўно давяраюць прадукцыі камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскхлебпрам», якое з году ў год радуе нас багатым асартыментам і высокай якасцю выпечкі.

Да светлага свята Уваскрэсення Хрыстова прадпрыемства заўсёды рыхтуецца асабліва: сваім спажыўцам яно прапаноўвае амаль 80 відаў тэматычнай прадукцыі — на любы густ і кашалёк. Велікодныя кулічы і кексы (якія, у адпаведнасці з класічнай рэцэптурай, вырабляюцца толькі з натуральных кампанентаў) паступаюць у продаж у розных «вагавых катэгорыях» (ад 200 да 800 грамаў), з разнастайнымі варыянтамі аздаблення і ўпакоўкі.

— Мы імкнёмся задаволіць патрэбы ўсіх сваіх спажыўцоў, — тлумачыць **галоўны тэхнолаг прадпрыемства Ніна Канстанцінаўна ЛУШЧЫК**, — таму асартымент робім максімальна разнастайным. Пры гэтым галоўны націск усё ж такі робім на класічных рэцэптах (такіх, як куліч «Пасхальны»). Яны заўсёды карыстаюцца попытам. Кекс «Праздничный», напрыклад, выпякаецца ўжо гадоў 20 і ўвесь гэты час застаецца запатрабаваным. Яго можна назваць «бацькам», родапачынальнікам цэлай сям'і нашых кексаў («Мінскі», «К Пасхе», «Царскі», «Светлы» і г.д).

Асаблівую ўвагу апошнім часам пакупнікі пачалі звяртаць на аздобу выпечкі. Нашы кексы і кулічы маюць самыя разнастайныя цукровыя пасыпкі, упрыгожваюцца памадкамі, арэхамі, мармеладам, масцічнымі кветкамі. Асабліва раю пакаштаваць кекс «Мінскі», які вылучаецца багатым аздабленнем.

Увогуле куліч (у адрозненне ад здобнага кекса) лічыцца булачным вырабам. Ён утрымлівае менш цукру і тлушчу і таму з'яўляецца меней каларыйным. Калі ж вы прывыклі падлічваць кожную спажытую калорыю, «Пасхальная» булка — гэта ваш варыянт святочнай выпечкі. Між іншым, упрыгожана яна не менш багата за кулічы і кексы і знешне ад іх амаль нічым не адрозніваецца.



Для людзей, якія па стане здароўя вымушаны абмяжоўваць сябе ў салодкім, прадпрыемства прапануе сустрэць свята з хлебам «Абрыкосавы дыябетычны», дзе замест цукру выкарыстаны фруктоза і здробненая курага.

Вернікі набываюць велікодную выпечку загадзя, каб напярэдадні свята асвяціць яе ў царкве ці касцёле. Таму вельмі важна, каб кекс, куліч ці булка доўгі час не чарсцвелі. Тэрміны захоўвання велікоднай выпечкі «Мінскхлебпрама» вагаюцца ў памежку ад 36 гадзін да 12 сутак. Натуральна, прадукт ва ўпакоўцы застаецца свежым і мяккім больш доўга. У крамах сталіцы можна знайсці кексы і кулічы ў тэрмастабільнай форме (спецыяльнай гарачатрывалай паперы), у харчовай вакуумнай плёнцы, у святочных пакетах, увогуле без упакоўкі. Побач з неўпакаванымі прадуктамі будуць прадавацца тэматычныя каляровыя бляшаныя скрыначкі, куды можна пакласці велікодную выпечку.

Прыхільнікі тартоў змогуць парадаваць сябе і сваіх блізкіх салодкім шэдэўрам хлебазавода № 2 КУП «Мінскхлебпрам», які называецца «Сакавічок». Торт упрыгожаны шакаладнымі фігуркамі анёлаў і надпісам «С Пасхой!»



Адна з лепшых кандытараў хлебазавода № 5 Таццяна КАРПЕКА.

## Націск на натуральнасць

Ні адно сапраўднае свята не абыходзіцца без торта: паход у госці, адзначэнне дня нараджэння, любой радаснай падзеі ўвогуле.

Усіх відаў тартоў, якія сёння прапануюць нам вытворцы, — не пералічыць. Па выпякаемых паўфабрыкатах (каржах) тарты падзяляюцца на бісквітныя, пясочныя, заварныя, паветранаарэхавыя, слаёныя, мядовыя і г.д. Хлебазавод № 2 «Мінскхлебпрама» прапануе арыгінальны торт з бісквітамі з іржаной мукі — «Уладар кольцаў». Торт вельмі карысны і нізкакаларыйны. У залежнасці ад тыпу крэму тарты могуць быць раслінна-вяршковымі, суфлейнымі, бялковымі, тварожна-раслiннымі, сметанковымі і г.д. У апошні час беларускія кандытары ўсё больш вырабляюць камбінаваных тартоў — з рознымі відамі каржоў і крэму.

Значна абагацілася смакавая «палітра» раслінных вяршкоў.



Салодкія шэдэўры да святочнага стала ад майстра-кандытара Надзеі ВАРАЎКІ.

— Увогуле, раслінныя вяршкі — нетрадыцыйны для нашага рэгіёна прадукт, які сам па сабе не мае яскрава выражанага смаку, — тлумачыць Ніна Канстанцінаўна. — Мы доўга эксперыментавалі з рознымі дабаўкамі і сёння прапануем спажыўцам тарты з раслінна-вяршковымі крэмамі, якія маюць смак згушчанага малака, фруктаў (лімона, апельсіна, маракуі), ягад, ёгурту, карамелі, цэрамісу. Можна казаць, айчынныя кандытары максімальна адаптавалі экзатычныя раслінныя вяршкі да смакавых схільнасцяў беларусаў. Увогуле паступова вяртаецца мода на натуральнасць (нашы суайчыннікі хочуць спажываць не толькі смачны, але і натуральны прадукт), таму доля саміх раслінных вяршкоў у нашых тартах скарачаецца за кошт павелічэння працэнту ўтрымання натуральных дабавак (згушчанага малака, ягад, карамелі і г.д.).

Нязменным попытам на працягу дзесяцігоддзяў карыстаюцца ўсім вядомыя тарты «Казка», «Кіеўскі», «Ленінградскі», «Птушынае малако», «Напалеон» і інш. На долю «класікі» прыходзіцца да 30 працэнтаў усіх тартоў, якія вырабляе сёння КУП «Мінскхлебпрам». Астатнія 70 працэнтаў — разнастайныя навінкі. Апошнім часам прадпрыемства актыўна ўкараняе ў вытворчасць рэцэптуры з паніжанай каларыйнасцю. Варта ўзгадаць серыю тартоў на аснове замарожаных ягад: «Чарнічная палітра», «Вішнёвая палітра», «У сне і наяве» (з клубніцамі), «Цірольскі з ягадамі» (з вішняй), «Персікавы рай», «Белы танец» (з лімонам) і інш.

Расце доля тартоў з тварожным крэмам. Дзякуючы тэхналагічным дасягненням сталічнага ГМЗ № 2, які пачаў вырабляць тварог з тэрмінам захоўвання 14 сутак, КУП «Мінскхлебпрам» змог прапанаваць спажыўцам багаты выбар тварожных тартоў з тэрмінам захоўвання 108 гадзін (4,5 сутак). Найбольш папулярнымі сталі «Мінчаначка» і «Тварожны з фруктамі».

Не так даўно для прыгатавання тартоў на прадпрыемстве пачалі выкарыстоўваць кефір (і для выпечкі каржоў, і для вырабу крэму). Ён надае торту непаўторны пяшчотны смак і лёгка засвойваецца арганізмам. Калі хочаце самі пераканацца ў гэтым, абавязкова пакаштуйце «Каралеву Марго».

## Ядомы партрэт

У склад камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскхлебпрам» уваходзіць 7 хлебазаводаў, 5 з якіх маюць сваю кандытарскую вытворчасць. Самы пашыраны кандытарскі цэх месціцца на хлебазаводзе № 5. За суткі тут вырабляецца ў сярэднім 3,5-4 тоны ласункаў, а напярэдадні святаў (Новы год, 8 Сакавіка) — да 12 тон.

**ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА.** *Хлебазавод № 5 быў уведзены ў эксплуатацыю ў 1967 годзе. Напачатку ён меў толькі хлебны цэх. Яго першымі вырабамі былі: хлеб «Арнаўт Кіеўскі», хлеб «Кішынёўскі», батоны «Падмаскоўны», «Паляніца» і г.д. Сёння хлебны цэх выпускае 60-65 тон прадукцыі ў суткі. Найбольшай папулярнасцю ў мінчан карыстаюцца хлеб «Майскі», батон «Ласунак». У 1973-м быў уведзены ў строй булкавы ўчастак, з магутнасцю 8-10 тон у суткі. Сталічныя жыхары добра ведаюць яго «Рагалік новы», «Рагалік моладзевы», булку «Верасовую», «Завітушку», хлеб «Крымскі» з лактулозай, пляцёнку «Гарадскую», рулет «Макавы» і інш. Менавіта на булкавым участку вырабляецца велікодная выпечка. З 1973 года на заводзе пачаў працаваць кандытарскі цэх.*



Кантралёр кандытарскага ўчастка Настасся ВІХРАВА.

Не так даўно на заводзе № 5 усталявалі цудоўную машыну — кандытарскі каляровы прынтар, які дазваляе пераносіць на вафельную ці шакаладную пласціну любы малюнак і фотаздымак. Пласціна пакрываецца харчовым гелем і змяшчаецца на торт. Яна цалкам ядомая, аднак пры жаданні яе можна захаваць на памяць як сувенір. На самім заводзе ёсць багатая калекцыя гатовых малюнкаў — з героямі мультфільмаў і казак (бэтмэнам, барбі, далмацінцамі), з букетамі і кветкавымі кампазіцыямі, са знакамі задыяка, з гоначнымі аўтамабілямі і г.д. Вы можаце заказаць торт з лагатыпам фірмы для вашага шэфа, з фотаздымкам дачы для сваёй цешчы і заўсёды будзеце ўпэўнены, што дорыце эксклюзіў. Такія заказныя тарты з малюнкамі носяць агульную назву «Знакі задыяка». Зрабіць заказ можна ў фірменных крамах — «Гарачы хлеб» пры заводзе № 5 на вул. Каліноўскага, 4 і «Каласок» на вул. Карастаянавай, 17.

З нядаўняга часу на 5-м хлебазаводзе «Мінскхлебпрама» з'явілася яшчэ адно прыстасаванне — для нарэзкі паветрана-арэхавых (воздушноореховых) тартоў.



Начальнік вытворча-тэхналагічнай лабараторыі хлебазавода № 5 Галіна ТАРАХОВІЧ.

— У хатніх умовах нарэзка паветрана-арэхавых паўфабрыкатаў выклікае пэўныя цяжкасці (корж даволі сухі і вельмі моцна крышыцца), — расказвае **начальнік вытворча-тэхналагічнай лабараторыі завода № 5 Галіна Ігнатаўна ТАРАХОВІЧ**, — а наша машына наразае торт на роўныя сегменты, кожны з якіх аздабляецца асобна. У продажы сёння ёсць як цэльныя тарты з паветрана-арэхавымі паўфабрыкатамі («Белая вежа», «Кіяўляначка», «Кіеўскі», «Белавежскі»), так і нарэзаныя. Розніца ў цане паміж імі зусім нязначная. Акрамя тартоў з дапамогай нашай машыны мы наразаем пірожныя і рулеты.

На заводзе № 5 пашырылі вытворчасць тартоў на аснове новых пяшчотных арыгінальных паўфабрыкатаў з тварожнымі, ёгуртавымі, ягаднымі, фруктовымі, карамельнымі і кафейнымі дабаўкамі ў спецыяльных кальцавых формах («Заслаўскі», «Карона»). Аматарам салодкага раім пакаштаваць тарты з дамашнімі бісквітамі на смятане «Цірольскі з ягадамі» і «Чайны ліст».

## З «бульбачкамі» і «грыбочкамі»

Каб мець больш поўнае ўяўленне аб прадукцыі кандытарскага цэха хлебазавода № 5 — абавязкова пакаштуйце яго пірожныя.

Вялікім попытам у мінчан даўно карыстаюцца эклеры з шакаладна-арэхавай, тварожна-раслiннай, сметанковай, кафейнай начынкамі, з яйкавым лікёрам, з абсыпкай, арыгінальныя цэрамісу. Ёсць эклеры масай у 50-60 грамаў, ёсць і драбнейшыя (па 10-15 грамаў). Звярніце ўвагу на «казачныя» пірожныя — у форме вежаў, раслінак, якія парадуюць вашых дзетак.



Асобнай гаворкі заслугоўваюць наборы пірожных, якія вырабляе хлебазавод № 5. Напрыклад, «Мінскі дэсерт» і «Да дэсерту». Абодва наборы могуць выпускацца як па 0,75 кг, так і 1,5 кг. Толькі першы абавязкова складаецца з ласункаў, якія ўтрымліваюць суфле і сметанковы крэм, а другі — суфле і раслінныя вяршкі.

Набор «Труфельны» (0,7 кг) параім аматарам «бульбачак» і бушэтак («грыбочкаў»). Паддон з пірожнымі пакуецца ў зручны для пераноскі кардонны баульчык з ручкай і акенцам.

У паўкілаграмовы набор «Візіт» уваходзяць названыя вышэй бушэтачкі і бісквіты «бярозка».

У склад кілаграмовай «Фантазіі» ўваходзяць пірожныя з суфле і натуральным сметанковым крэмам.

Хутка на паліцах сталічных крамаў з'явяцца дзве навінкі кандытарскага цэха хлебазавода № 5 — рулеты з суфлейнай начынкай, какосавай абсыпкай, са смакам вішні і лімона.

...На аздабленне кандытарскіх вырабаў існуе такая ж мода, як і на адзенне ці абутак.

Ёсць нават цэлая навука ўпрыгожвання ласункаў: які колер успрымаецца падсвядомасцю, як ядомы, які — не, які — больш святочны, які — рамантычны і г.д.

Цікава, што на Захадзе сёння назіраецца яскрава выражаная тэндэнцыя да мінімалізму ў аздабленні кандытарскіх вырабаў. У многім гэта абумоўлена пераходам на поўную аўтаматызацыю вытворчасці і скарачэннем колькасці высакаякасных спецыялістаў.

У Беларусі яшчэ захавалася школа першакласных кандытараў, мастакоў сваёй справы, здольных ператварыць любы торт ці кекс у сапраўдны мастацкі твор. Акрамя таго, большая частка дэкаратыўных элементаў у нас наносіцца ўручную.

Калі ў наступны раз будзеце радаваць сябе і сваіх родных выпечкай КУП «Мінскхлебпрама», узгадайце, што ў кожным торце, у кожным пірожным захаваўся кавалачак душы кандытара.

**Інга МІНДАЛЁВА.**
**Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

*УНП 100056428*



**Адрасы і тэлефоны фірменных крамаў КУП «Мінскхлебпрам», дзе можна набыць гарачы хлеб, свежую выпечку, велікодную прадукцыю:**

| | |
|---|---|
| Крама «Свежы хлеб» хлебазавода № 1 | Мінск, вул. Ракаўская, 25 (203-52-18) |
| Крама пякарні хлебазавода № 1 | Мінск, вул. Ракаўская, 30 (229-23-44) |
| Крама «Гарачы хлеб» хлебазавода № 2 | Мінск, вул. Крапоткіна, 33 (293-11-98) |
| Крама «Хлебны куток» хлебазавода № 2 | Мінск, вул. Крапоткіна, 33 (286-73-01) |
| Крама «Свежы хлеб» хлебазавода № 3 | Мінск, пр-т Партызанскі, 97 (295-44-54) |
| Крама «Гарачы хлеб» хлебазавода № 4 | Мінск, вул. Казінца, 31 (278-77-22) |
| Крама «Гарачы хлеб» хлебазавода № 5 | Мінск, вул. Каліноўскага, 4 (281-29-95) |
| Крама «Каласок» хлебазавода № 5 | Мінск, вул. Карастаянавай, 17 (290-18-46) |
| Крама «Гарачы хлеб» хлебазавода № 6 | Мінск, вул. Гурскага, 19 (252-37-84) |
| Крама-склад аптовага гандлю хлебазавода № 6 | Мінск, вул. Гурскага, 19 (251-50- 87) |
| Фірменная крама «Каравай» | Мінск, пр-т Незалежнасці, 38 (288-23-12) |
| Крама № 11 | Мінск, ГКУП «Мінскі Камароўскі рынак», 5-ы сектар сезоннай часткі |
| Гандлёвае месца хлебазавода № 3 | Мінск, ГКУП «Мінскі Камароўскі рынак», 4-ы сектар, рад 16 крытай часткі |
| Гандлёвае месца хлебазавода № 3 | Мінск, пр-т Партызанскі, 99, рынак «Гандлёвыя рады» Заводскага раёна, крама № 30 |

